1. Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь. Общие сведения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbrb.by/Coins Banknotes. – Дата доступа: 20.03.2021.

2. *Вайцэхоўская, В. У.* Славутыя мастакі з Беларусі. Уладзімір Басалыга / В. У. Вайцэхоўская. – Мінск : Беларусь, 2022. – 95 с.

3. Каталог памятных монет, выпущенных в обращение Национальным банком Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbrb.by/CoinsBanknotes/Coins/Commemorative/Catalog. – Дата доступа: 15.08.2024.

УДК 021:37.091.4Сухомлинский

**І. І. Ліхараў,**
*настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва імя М. Ф. Сафонава», Магілёў, Беларусь*

## ПОГЛЯДЫ ВАСІЛЯ СУХАМЛІНСКАГА НА МЕСЦА БІБЛІЯТЭКІ Ў АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ШКОЛЫ

**Анатацыя.** У артыкуле раскрываецца месца бібліятэкі ў педагагічнай сістэме выдатнага савецкага педагога-наватара В. А. Сухамлінскага «Школа радасці» як цэнтра духоўнага жыцця навучальнай установы і важнейшага рэсурсу навучання і выхавання. Выдзелены прыярытэтныя напрамкі дзейнасці школьнай бібліятэкі: кіраўніцтва чытаннем, узаемадзеянне бібліятэкара і педагогаў, камплектаванне бібліятэчных фондаў, арганізацыя «вечнай бібліятэкі», бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне навучэнцаў і работа з бібліятэчным актывам.

**Ключавыя словы:** школьныя бібліятэкі, бібліятэчнае абслугоўванне навучэнцаў, кіраўніцтва чытаннем, камплектаванне бібліятэчных фондаў, «вечная бібліятэка», бібліятэчны актыў.

**I. Likharau,**
*History teacher of the State educational institution "Secondary school No. 19 of Mogilev named after M. Safonov", Mogilev, Belarus*

## VASILY SUKHOMLINSKY'S VIEWS ON THE PLACE OF THE LIBRARY IN THE EDUCATIONAL SPACE OF THE SCHOOL

**Abstract.** The article reveals the place of the library in the pedagogical system of the outstanding Soviet teacher-innovator V. Sukhomlinsky "School of Joy" as the center of the spiritual life of the educational institution and the most important resource of education and upbringing. The author highlights the priority areas of the school library's activity: the management of reading, the interaction of librarian and teachers, the acquisition of library collections, the organization of the "eternal library", library and bibliographic services for students and work as a library asset.

**Keywords:** school libraries, library services for students, reading guidance, acquisition of library collections, "eternal library", library asset.

Педагог-наватар В. Сухамлінскі пакінуў значны след у савецкай педагогіцы. Яго прагрэсіўныя тэарэтычныя погляды, падмацаваныя велізарным практычным вопытам, сталі асновай пабудовы аўтарскай педагагічнай сістэмы «Школа радасці», у якой вялікая ўвага надавалася прапагандзе кнігі і арганізацыі эфектыўнага бібліятэчнага абслугоўвання педагогаў і вучняў. В. Сухамлінскі бачыў бібліятэку як асветны цэнтр не толькі навучальнай установы, але і населенага пункта, дзе яна знаходзіцца. Клопат аб бібліятэках пранізвае ўсю педагагічную дзейнасць В. Сухамлінскага. Звяртаючыся да настаўнікаў, ён адзначаў: «калі вы жадаеце, каб юнацтва адчувала нястрымную смагу ведаў, паклапаціцеся аб галоўных, найважнейшых ачагах духоўнай культуры – бібліятэках» [3, с. 508].

Менавіта бібліятэку педагог лічыў значным рэсурсам фарміравання культуры чытання і засваення бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў. Галоўнай задачай бібліятэкі павінна быць не толькі засваенне ведаў, уменняў, навыкаў, а і творчы пошук, мысленне. Самастойнасць і творчы характар фарміруюцца дзякуючы таму, што ў разумовай рабоце вучня ёсць элементы даследавання, якія патрабуюць ад вучня навыкаў самастойнага пошуку неабходнай інфармацыі ў бібліятэцы. Чым сталей вучань, тым важней для яго ўменне карыстацца дадатковай літаратурай, уменне знаходзіць яе, таму патрабуюцца пэўныя бібліятэчна-бібліяграфічныя веды. Навучаць гэтаму трэба мэтанакіравана, сістэматычна, пачынаючы з пачатковай школы.

Прыярытэтным напрамкам у дзейнасці школьнай бібліятэкі В. Сухамлінскі лічыў кіраўніцтва чытаннем, якое пачыналася з першага знаёмства дзіцяці з бібліятэкай. З вучнямі першых класаў у бібліятэцы прадугледжваюцца экскурсіі і гутаркі. У кіраўніцтве чытаннем вялікая роля адводзіцца індывідуальнай рабоце з кожным чытачом. Асноўнай формай работы з'яўляюцца гутаркі пры запісе ў школьную бібліятэку, падборы і выдачы яму кніжкі, вяртанні яе назад у бібліятэку. Дзейнасць школьнай бібліятэкі і педагагічнага калектыву па выхаванні культуры чытання і фарміраванні бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў павінна садзейнічаць таму, каб кніга стала для кожнага вучня сябрам і мудрым настаўнікам.

Не пакідаў па-за ўвагай В. Сухамлінскі і арганізацыю работы бібліятэкара з педагогамі. Падкрэсліваў, што выхаваўчая праца ў школе не можа праводзіцца асобна настаўнікам і асобна бібліятэкарам, а павінна быць толькі сумеснай. Школьны бібліятэкар – паўнапраўны член педагагічнага калектыву. Функцыі бібліятэкара разнапланавыя: папулярызатар кнігі сярод настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў; арганізатар і кіраўнік працэсу пазакласнага чытання; мудры настаўнік, выхавальнік, які ведае, адчувае жыццё кожнага вучня ў свеце кнігі. У канцы кожнага года педагагічны калектыў школы на педагагічным савеце абмяркоўвае якасць кніжнага фонду школы і прапануе выданні для набыцця [2, с. 72].

Адзін з галоўных напрамкаў дзейнасці бібліятэкі – камплектаванне. У яго аснове наступныя крытэрыі: адлюстраванне агульначалавечых каштоўнасцей; адлюстраванне духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Васіль Аляксандравіч папярэджваў, што нельга дапусціць, каб на бібліятэчную паліцу папала «хоць адна “аднадзёнка” і не папала каштоўная кніжка» [1, с. 361].

У школьнай бібліятэцы складаецца спецыяльная калекцыя – «вечная бібліятэка» – «сховішча духоўнай культуры народа» [Там жа, с. 360]. Такая калекцыя фарміруецца з буквароў, па якіх вучыліся дзяды і прадзеды вучняў, а таксама з кніг залатога фонду айчыннай і сусветнай літаратуры. Па сутнасці, гэта – музейны пакой. У гэтых кнігах, – адзначаў В. А. Сухамлінскі, – «жывыя і бессмяротныя карані народа» [Там жа, с. 361].

Важным сродкам фарміравання ў малодшых школьнікаў любові да кнігі з’яўляюцца бібліятэчныя ўрокі, сістэма якіх падпарадкавана выхаванню ў малодшых школьнікаў свядомага і адказнага стаўлення да кнігі не толькі як матэрыяльнай, але і як духоўнай каштоўнасці.

У кнізе ачалавечваецца праца, увасабляецца майстэрства, працавітасць, і маральная годнасць чалавека. В. А. Сухамлінскі пастаянна падкрэсліваў важнасць адказнасці дзіцяці за ўзятую ў карыстанне кнігу, беражлівых адносін да яе: «кнігу, якую ты вяртаеш у бібліятэку, павінна быць у значна лепшым стане за тую, што ты атрымаў; памятай, што кнігу ствараюць сваёй працай шмат людзей» [2, с. 168].

Пры бібліятэцы арганізуюцца аматарскія аб’яднанні юных кнігалюбаў, дзе дзеці чыталі цікавыя кнігі і рамантавалі іх, вядзецца журнал уліку прачытаных кніг.

Асаблівую ўвагу надаваў В. А. Сухамлінскі актыву школьнай бібліятэкі, які збіраўся штомесяц. На пасяджэннях абмяркоўваўся альбом маляваных дзіцячых водгукаў аб цікавых прачытаных кнігах. Даўжнікам рыхтаваліся напаміны. В. А. Сухамлінскі падчас наведвання такіх пасяджэнняў даваў саветы і практычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы з кнігай.

Такім чынам, у педагагічнай сістэме В. А. Сухамлінскага «Школа радасці», школьная бібліятэка – цэнтр духоўнага жыцця школы і важнейшы рэсурс арганізацыі навучання і выхавання. У арганізацыі бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання вучняў і настаўнікаў педагог-наватар выдзяляў наступныя прыярытэтныя напрамкі: камплектаванне бібліятэчнага фонду ў адпаведнасці з рэальнымі запытамі вучняў і педагогаў; узаемадзеянне бібліятэкара і педагога; кіраўніцтва чытаннем; фарміраванне культуры чытання і бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў вучняў і педагагічных работнікаў; фарміраванне пачуцця адказнасці ў вучняў за захаванасць фондаў, якімі яны карыстаюцца; далучэнне вучняў да лепшых узораў айчыннай і сусветнай літаратуры; фарміраванне бібліятэчнага актыву.

1. *Сухомлинский, В. А.* Как воспитать настоящего человека / В. А. Сухомлинский // Избранные произведения : в 5 т. / редкол.: А. Г. Дзеверин [и др.]. – Киев, 1979. – Т. 2. – С. 159–446.
2. *Сухомлинский, В. А.* Павлышская средняя школа / В. А. Сухомлинский // Избранные произведения : в 5 т. / редкол.: А. Г. Дзеверин [и др.]. – Киев, 1980. – Т. 4. – С. 7–412.
3. *Сухомлинский, В. А.* Разговор с молодым директором / В. А. Сухомлинский // Избранные произведения : в 5 т. / редкол.: А. Г. Дзеверин [и др.]. – Киев, 1980. – Т. 4. – С. 413–657.

УДК 02/.021

**Н. В. Лопатина,**
*доктор педагогических наук, профессор, заведующий кафедрой библиотечно-информационных наук федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Московский государственный институт культуры», Москва, Россия*

## ГАРМОНИЗАЦИЯ БИБЛИОТЕЧНОЙ ТЕОРИИ, ПРАКТИКИ И ОБРАЗОВАНИЯ КАК ПРИОРИТЕТ РАЗВИТИЯ ОТРАСЛИ В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

**Аннотация.** Поставлена задача совершенствования отношений библиотечно-информационных наук, практики библиотечного дела и библиотечно-информационного образования. Раскрыты проблемы развития отрасли в русле проактивного подхода. Предлагаемое решение представляет гармонизацию институтов библиотечной отрасли. Гармонизация рассматривается как стратегия приведения институтов библиотечной отрасли в состояние согласованности и взаимного соответствия целей, интересов, действий, процессов, свойств, качеств. Раскрыто содержание процесса гармонизации отраслевых институтов библиотечной сферы. Выявлены факторы, определяющие содержание стратегии гармонизации отраслевых институтов.

**Ключевые слова:** библиотека, библиотечная теория, библиотечно-информационные науки, библиотечно-информационное образование, библиотечная практика.

**N. Lopatina,**
*Doctor of Pedagogical Sciences, Professor, Head of the Department of Library and Information Sciences of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "Moscow State Institute of Culture", Moscow, Russia*

## HARMONIZATION OF LIBRARY THEORY, PRACTICES AND EDUCATION AS A PRIORITY FOR THE DEVELOPMENT OF THE INDUSTRY IN MODERN CONDITIONS

**Abstract.** The article sets the task of improving the relations of library and information sciences, library practice and library and information education. The